


# Фэрдынанд Рушчыц

**Фэрдынанд Рушчыц нарадзіўся ў Цэнтральнай Беларусі, у родавым фальварку Багданаў недалёка ад Валожына, але ўсё дзяцінства і юнацтва мастака прайшлі ў беларускай сталіцы – у Мінску.**

Цягам сямі гадоў Рушчыц навучаўся ў славутай Мінскай класічнай гімназіі, што скончыў у 1890 годзе з залатым медалём. Адначасова падчас навучання ў гімназіі наведваў лекцыі жывапісу расійскага мастака Кузьмы Ермакова, выхаванец Пецярбургскай акадэміі мастацтваў.

Пасля сканчэння Мінскай гімназіі Рушчыц быў паступіўшы на юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэту. Але змяніў універсітэт на Акадэмію мастацтваў, дзе вучыўся цягам 1892–1897 гадоў у Івана Шышкіна і Архіпа Куінджы. З таго часу бываў у сталіцы Беларусі наездамі, падчас вакацыяў. У сваім дзённіку ён называе бацькоўскі дом у Мінску родным гняздом. Чытаем у дзённіку Рушчыца такія радкі: "Мінск 23.IV–7.V(1895). Я зноў у Мінску. (...) Цяпло роднага гнязда, якога ў свеце так бракуе, мяне адаграваe. Праз два дні зноў пачаў маляваць (...)".

Рушчыц стаў самым вядомым на свой час майстрам менавіта беларускага пейзажу. Ягоныя карціны, што прынеслі яму славу, малюнкі ды эцюды былі створаныя менавіта ў ваколіцах роднага Багданава і Мінску. У ягонай творчасці знайшлі адлюстраванне краявіды, жыццё і побыт беларускага народу, праявіліся традыцыі беларускага рэалістычнага жывапісу. Мастак матэрыялізаваў нацыянальна-патрыятычны пафас, характэрны для мастацтва Усходняй Еўропы мяжы XIX–XX стагоддзяў. Яго вельмі цэльная духам творчасць мела непасрэднае дачыненне да фармавання беларускага нацыянальна-рамантычнага пейзажу канца XIX – пачатку XX стагоддзя. Ягоная творчасць паўплывала на далейшае развіццё жанру пейзажу і ў польскім, і ў літоўскім мастацтве. Сам ён быў патрыётам Польшчы, не адрываў сябе ад польскае культурнае традыцыі, але меў складаную

“крэсовую” ідэнтычнасць. Дачка мастака Яніна Рушчыц сцвярджала, што бацька заўсёды лічыў сябе “тутэйшым”, падкрэсліваўшы і свае беларускія карані.

Палотны Рушчыца неаднаразова экспанаваліся ў Пецярбурзе, Маскве, Варшаве, Вільні, Парыжы. Ён застаўся ў гісторыі і як выбітны настаўнік. Рушчыц быў прафесарам Школы прыгожых мастацтваў у Варшаве і Кракаўскай акадэміі мастацтваў, браў чынны ўдзел у адраджэнні Віленскага ўніверсітэту.

Але самага вялікага першага поспеху дамогся менавіта дома, у родным Мінску. У 1911 годзе ў памяшканнях польскага клубу “Ognisko” праходзіла вялікая і прэтэнцыёзная выстава прыгожых мастацтваў, на якой былі прэзентаваныя творы 47 тутэйшых і польскіх мастакоў. Арганізаваў выставу скульптар Яраслаў Тышынскі. Дапамагаў Фэрдынанд Рушчыц, на той час ужо слынны мастак і дызайнер, варшаўскі прафесар. На той славутай мінскай выставе экспанаваліся і ювелірныя вырабы Рушчыца. Але галоўным творам усёй выставы сталася ягоная карціна “Nec Mergitur”, напісаная ў 1905-м. Цяпер гэты шэдэўр Фэрдынанда Рушчыца, што быў упершыню прэзентаваны публіцы ў Мінску, зберагаецца ў Нацыянальным мастацкім музеі Літвы.

Урэшце, Рушчыц здабыў вялікую славу жывапісца, тэатральнага мастака, графіка, паліграфічнага дызайнера. Культурніцкае жыццё Вільні 1910–1920 гадоў, усёй міжваеннай Польшчы і Заходняй Беларусі, немагчыма ўявіць без асобы Рушчыца. Да таго ж мастак быў старшынём Камісіі аховы помнікаў старажытнасці, шмат вандраваў па Беларусі, замалёўваў руіны замкаў і адметныя помнікі даўніны. Палотны мастака сёння ўпрыгожваюць музейныя зборы Польшчы, Літвы, Расіі, іншых еўрапейскіх і амерыканскіх збораў. Апошнія гады свайго жыцця Фэрдынанд Рушчыц правёў у беларускім Багданаве, дзе і памёр 30 кастрычніка 1936 года, там пахаваны. Рушчыц наўпрост спрычыніўся да стварэння прафесійнае школы мастацтва Беларусі, кіруючы аддзелам мастацтваў Віленскага ўніверсітэту, ягонымі вучнямі былі дзясяткі беларускіх мастакоў, большая частка біяграфіі ды творчасці звязаная з Беларуссю. Ён шматкроць падкрэсліваў сваю спрычыненасць да роднага краю, дзе атрымаў і першую мастацкую адукацыю, і браў актыўны ўдзел у культурніцкім жыцці Беларусі. Такім чынам справядліва называць яго і беларускім мастаком, звязаным з мастацкаю традыцыяй Польшчы, Літвы і Расеі.